# СУФІКСАЛЬНЫЯ НЕАЛАГІЗМЫ Ў МОВЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПУБЛІЦЫСТЫКІ

**Шпакевіч Яніна (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт**

Багатая сістэма суфіксаў, якія маюць living рознае значэнне, здольнасць далучацца да асноў розных часцін мовы, робяць суфіксацыю адным з самых прадуктыўных спосабаў словаўтварэння ў сучаснай беларускай мове. Суфіксальныя неалагізмы нярэдка сустракаюцца ў мове беларускіх газет «Звязда», «Краязнаўчая газета» (выходзіла да канца 2023 г.), «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкая газета», «Чырвоная змена».

Мэта артыкула – выявіць суфіксальныя неалагізмы ў мове сучасных беларускіх газет і вызначыць іх прадуктыўнасць.

Метадалагічную аснову даследавання складаюць працы В. І. Уласевіч [1], А. В. Солахава і Б. А. Крука [2].

Пры ўтварэнні суфіксальных неалагізмаў-назоўнікаў адзначаюцца наступныя словаўтваральныя тыпы:

1) назоўнік + суфікс *-овец (-авец), -нік* = назоўнік са значэннем ‘асоба паводле яе адносін да прадмета, з’явы або да другой асобы, названай утваральным словам’: ***пратэстовец*** ‘той, хто ўдзельнічае ў пратэстах’: *У ЗША* ***пратэстоўцы*** *запатрабавалі ў Кангрэса ўзмацніць кантроль над абаротам зброі* (Звязда, 2022, 31 мая, с. 2); *натавец* ‘салдат НАТА’: *…афганцы, якія жывуць і ў Беларусі, памятаюць гэтую дабрыню савецкіх салдат, сержантаў, афіцэраў. І дагэтуль ненавідзяць* ***натаўцаў*** *і амерыканцаў* (Звязда, 2024, 15 лют., с. 4); *алімпіяднік* ‘удзельнік алімпіяды па якім-небудзь прадмеце’: *Калегі Наталлі Карпыза здзіўляюцца, як у яе ўсё атрымліваецца: падрыхтаваць дыферэнцыраваныя заданні да ўрокаў у профільных групах, удзельнічаць у інавацыйным праекце, займацца з* ***алімпіяднікамі****…* (Настаўніцкая газета, 2023, 1 жн., с. 7);

2) прыметнік + суфікс *-ік* = назоўнік са значэннем асобы як носьбіта прыметы, названай утваральным словам: ***мэтавік*** ‘абітурыент, які прэтэндуе на мэтавыя месцы ў ВНУ’: *Адзін экзамен для* ***мэтавікоў*** (Звязда, 2023, 14 крас., с. 1);

3) дзеяслоў + суфікс -|*ль*|*нік* = назоўнік са значэннем асобы паводле дзеяння, названага ўтваральным словам: *распальвальнік* ‘той, хто распальвае, развязвае што-небудзь’: *Прадстаўнік кітайскага знешнепалітычнага ведамства Ван Вэньбінь апраўдана назваў ЗША найбуйнейшым* ***распальвальнікам*** *канфліктаў у свеце…* (Звязда, 2023, 25 лют., с. 11);

4) назоўнік + суфікс *-ык* = назоўнік са значэннем напрамку, сістэмы, прадстаўніком якіх з’яўляецца названая асоба’: *футурыстыка* ‘прадбачанне будучага развіцця чалавецтва і асобных сфер жыцця грамадства’: – *Можна было б сысці ў* ***футурыстыку****, але я буду расказваць аб тых тэхналогіях, якія ўжо прыйшлі ў медыцынскую практыку ці вось-вось прыйдуць…* (Звязда, 2024, 9 студз., с. 7);

5) дзеепрыметнік + суфікс *-к(а)* = назоўнік са значэннем рэчыва, якое характрызуецца прыметай, названай утваральным *словам’: сушонка* ‘сушаны торф’: *З 2016 года займаюцца пастаўкай тарфяной “****сушонкі****” (13 %) для цэ-*

*ментных прадпрыемстваў, у прыватнасці, для завода "Краснасельскбудматэрыялы"* (Звязда, 2021, 2 ліст., с. 7);

6) дзеяслоў + суфікс *-нн(е)* = назоўнік са значэннем апрадмечанага дзеяння, названага утваральным *словам': спампоўванне* 'капіяванне элетроннага рэсурсу': *...Для падрыхтоўкі раздатачнага матэрыялу загадзя даю навучэнцам QR-спасылку для **спампоўвання**...* (Настаўніцкая газета, 2024, 2 лют., с. 8).

У мове беларускіх газет апошяга часу часцей за ўсё ўжываюцца прыметнікі-неалагізмы з суфіксам *-н-* з нейтральнай ступенню інтэнсіўнасці якасці. Утвараючыся ад асноў назоўніка, яны набываюць агульнае значэнне 'які адносіцца да таго, мае тое або якасць таго, што названа матывавальным словам': *батутны* 'такі, у якім размяшчаюцца батуты': *Яшчэ адзін **батутны** комплекс з'явіцца ў парку 900-годдзя Мінска* (Звязда, 2023, 4 мая, с. 7); *каранавірусны* 'які адносіцца да каранавіруса': *...вакцынацыя супраць грыпу і **каранавіруснай** інфекцыі важная для работнікаў сферы адукацыі, гандлю, грамадскага харчавання, камунальнай сферы* (Звязда, 2023, 21 вер., с. 3); *ковідны* 'прызначаны для лячэння хворых на ковід': *Больш за тры тыдні кардыяхірургічнае і кардыярэанімацыйнае аддзяленні працавалі як **ковідны** шпіталь* (Звязда, 2021, 2 ліст., с. 5); *пратэсны* 'які адносіцца да пратэстаў': *Нядзіўна, што прыбалтыйскую краіну захліснула **пратэсная** хваля* (Звязда, 2023, 4 мая, с. 13); *санкцыйны* 'які адносіцца да санкцый': *...у сучасным свеце нарастае дыктат сілы, пашыраецца практыка **санкцыйнага** пакарання "непакорлівых" краін* (Звязда, 2021, 13 кастр., с. 3).

Зафіксаваны адсутны ў слоўніках прыметнік *падтрымлівальны* 'які падтрымлівае што- або каго-небудзь', утвораны ад дзеяслова *падтрымліваць* пры дапамозе суфікса -|*ль*|*н*-, дзе *-ль-* з'яўляецца інтэрфіксам, што ўзнікае паміж дзеяслоўнай асновай на галосны і суфіксам *-н-*: *Пачаўшы сваё шэсце ў паўночных штатах Хар'яна і Пентжаб, дзясяткі тысяч сельгасвытворцаў на трактарах і грузавіках рушылі ў сталіцу, каб запатрабаваць мінімальных **падтрымлівальных** цэн на ўраджай* (Звязда, 2024, 15 лют., с. 4).

Радзей утвараюцца прыметнікі з суфіксамі *-ав-* і *-ск-*: *каршэрынгавы* 'які адносіцца да каршэрынгу': *Большасць прызначана для дзяржорганаў для выканання імі службовых функцый і вельмі карысная для **каршэрынгавых** кампаній і арганізацый, якія займаюцца груза- і пасажырскімі перавозкамі* (Звязда, 2023, 22 ліп., с. 5); *званарскі* 'які адносіцца да званара': *Я доўга ішла да гэтага выбару, але аднойчы перасіліла сябе і пераступіла парог **званарскай** школы...* (Звязда, 2023, 14 крас., с. 1); *студатрадаўскі* 'які мае адносіны да студэнцкіх атрадаў': *Прадстаўнікі БРСМ, у сваю чаргу, адзначылі важную ролю **студатрадаўскага** руху...* (Чырвоная змена, 2023, 26 ліст., с. 5).

Нячаста ўтвараюцца суфіксальныя дзеясловы. Адзінкавыя з іх фіксуюцца з суфіксамі *-ы-, -ава-, -а-*:

а) 'быць тым або ўтвараць дзеянне, уласцівае таму, хто названы ўтваральным словам': *валанцёрыць* 'быць валанцёрам; утвараць дзеянне, уласцівае валанцёру': ***Валанцёрыць** – гэта крута* (Краязнаўчая газета, 2023, студз., № 11, с. 7);

б) ‘утвараць (выконваць) дзеянне паводле таго, што названа ўтваральным словам’: *манетызаваць* ‘купіць за грошы’: *На пачатку лютага нашы самыя высокія, рамантычныя парыванні душы нехта хоча* ***манетызаваць*** (Настаўніцкая газета, 2024, 13 лют., с. 16);

в) ‘утвараць (выконваць) дзеянне пры дапамозе таго, што названа ўтваральным словам’: *лайкаць* ‘ставіць лайкі’: *Людзі пішуць, посцяць,* ***лайкаюць****, спрачаюцца – і ўсё гэта выносяць «на людзі»* (Звязда, 2023, 19 студз., с. 2).

Суфіксальныя прыслоўі-неалагізмы – з’ява нячастая ў беларускай публіцыстыцы нашага часу. Яны ўтвараюцца ад прыметнікаў, да асновы якіх дадаецца суфікс *-а* і выступаюць са словаўтваральным значэннем ‘адпаведна прыкмеце, якую называе ўтваральнае слова’: *крэатыўна* ‘адпаведна крэатыўнаму; творча’: *Цікава, займальна і* ***крэатыўна*** *арганізоўваюць выхаваўчую работу ва ўстановах адукацыі…* (Настаўніцкая газета, 2024, 13 лют., с. 13); *пратэсна* ‘адпаведна пратэснаму; выказваючы пратэст’: *Акрамя таго, абвінавачаныя заклікалі* ***пратэсна*** *настроеных грамядзян учыняць акты тэрарызму* (Звязда, 2023, 4 мая, с. 3).

Такім чынам, аналіз неалагізмаў сведчыць пра актыўныя словаўтваральныя працэсы, якія адбываюцца ў беларускай мове. Сярод суфіксальных наватвораў найбольшай прадуктыўнасцю ў мове сучаснай беларускай публіцыстыкі вызначаюцца назоўнікі і прыметнікі, радзей ужываюцца дзеясловы і прыслоўі.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па дагаворы № 1410/2021.*

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Уласевіч, В. І. Лексічныя працэсы ў беларускай мове 90-х гадоў XX ст. : дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 / В. І. Уласевіч. – Мінск, 2002. – 167 л.

2. Солахаў, А. В. Наватворы ў мове беларускай публіцыстыкі пачатку XXI ст. / А. В. Солахаў, Б. А. Крук. – Мазыр : МДПУ імя І. П. Шамякіна, 2021. – 160 с.

## ПРЫСТАВАЧНЫЯ НЕАЛАГІЗМЫ Ў МОВЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПУБЛІЦЫСТЫКІ

**Шпакевіч Яніна (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт**

Аналіз мовы тэкстаў сучаснай беларускай публіцыстыкі паказвае, што прэфіксацыя – далучэнне прэфікса да асновы ўтваральнага слова – з’яўляецца адносна прадуктыўным спосабам словаўтварэння. В. І. Уласевіч [1], А. В. Солахаў і Б. А. Крук [2] адзначаюць высокапрадуктыўнасць прэфіксаў *анты-, звыш-, пасля-, пост-, пра-, псеўда-, супер-* і іншых пры ўтварэнні наватвораў – назоўнікаў і прыметнікаў.

Багатая сістэма прэфіксаў, якія маюць рознае значэнне, адзначаецца і пры ўтварэнні назоўнікаў-неалагізмаў апошняга часу:

1) прэфікс *анты-* (грэч. *anti* – супраць) + назоўнік = назоўнік са значэннем ‘супрацьлеглае, процідзейнае таму, што названа ўтваральным словам’: ***антырэйтынг*** ‘супрацьлеглы рэйтынгу’: *Малдова знаходзіцца сярод лідараў сусветнага* ***антырэйтынгу*** *краін з самымі высокімі тэмпамі дэпапуляцыі* (Звязда, 2024, 15 лют., с. 13);